> **Грамадзяне Савецкага Саюза! Актыўна ўдзельнічайце ў сацыялістычным самакіраванні! Больш творчай ініцыятывы, вышэй ролю працоўнага калектыву!**
>
> (З Заклікаў ЦК КПСС).

ВЕДАМ — ЯКАСЦЬ!

# ОДА САМАСТОЙНАСЦІ

## ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ СТУДЭНТА СА СТАЖАМ

...РАЗМОВУ перарваў тэлефонны званок. Косця ўзяў трубку.

— Канстанцін? — прагучаў строгі мужчынскі голас, і мой знаёмы, студэнт тэхнічнай ВНУ, пазнаў яго: дэкан.

— Так,— адказаў з ледзь прыкметным хваляваннем.

— Калі ласка, папрасі каго-небудзь з бацькоў...

Дома была маці. Іменна ёй і паведаміў дэкан, што калі яе сын у двухдзённы тэрмін не ліквідуе запазычанасці, то будзе выключаны з інстытута.

Маці потым два дні піла валяр'янку, а Косцік, 20-гадовы здаравяк, хадзіў за ёю і пераконваў, што дэкан многіх так страшыць.

Каментарыі тут, як кажуць, не патрэбны. І ўсё ж не магу стрымацца, каб не прывесці думку В. Гаршкова, дацэнта Львоўскага сельскагаспадарчага інстытута: «ВНУ пачалі ўсё больш схіляцца да шкалярскіх метадаў работы са студэнтамі. Адсюль і злучэнне выключаючых адно другое паняццяў: вучыць, прымушаць вучыцца. Супярэчнасць абуральная. Вучыцца ж дарослы чалавек. Вучыцца таму, што павінна стаць для яго галоўнай справай жыцця».

Студэнты — дарослыя, самастойныя людзі, многія ўжо адслужылі ў арміі, паспелі папрацаваць на вытворчасці. Яны жэняцца і выходзяць замуж, самі становяцца бацькамі. Дык чаму, з якою мэтай кіраўніцтва ВНУ гаворку вядзе не з імі: маўляў, калі вы, таварышы бацькі, не прымусіце свайго сына сесці за падручнікі...

Калі чалавек не хоча вучыцца, навошта яго цягнуць за вушы? У імя чаго гэта робіцца? Каму патрэбен спецыяліст, які з горам папалам атрымаў свой «троечны» дыплом і прытрымліваецца прынцыпу: усё роўна, дзе працаваць, толькі б не працаваць? Такі спецыяліст нікому не патрэбен. Тады ў чым справа, чаму нядбайнага студэнта не выключаюць з інстытута, а перавагу аддаюць ледзь не скліканню бацькоўскіх сходаў? Незразумела...

І яшчэ адзін момант. Дазвольце напомніць, што слова «куратар» у перакладзе з латыні азначае «наглядчык». Першакурснікам наглядчык проста неабходны — дапаможа акліматызавацца, раскажа пра правілы ВНУ, распарадак студэнцкага жыцця. Але потым? Навошта куратар, скажам, чацвёртакурснікам? За правядзенне паліт-інфармацый, аказанне дапамогі адстаючым, за пасляховасць у групе, правядзенне розных культурных мерапрыемстваў павінна адказваць (і адказвае!) камсамольскае бюро групы. Я размаўляла са студэнтамі многіх ВНУ горада. Усе былі аднадушныя: на старэйшых курсах куратарская работа становіцца нікому не патрэбнай · «галачкай». Мабыць, ёсць сэнс прыслухацца да слоў студэнтаў? Адразу можна будзе забіць двух зайцаў: яшчэ шырэй адчыніць дзверы студэнцкай самастойнасці і з'эканоміць нямала дзяржаўных сродкаў.

Летась, калі ў якасці карэспандэнта ездзіла па будатрадах, нечакана для сябе сутыкнулася з сістэмай суправаджаючых. Калі вы, паважаны чытач, працавалі ў СБА пяць, дзесяць ці дваццаць гадоў назад, то, зразумела, не знаёмы з гэтай навіной.

...Атрад прыехаў пазней устаноўленага ў дагаворы тэрміну на два дні. Разам з прадстаўніком прымаючай арганізацыі я трэці дзень ішла на вакзал сустракаць студэнтаў. Мы непакоіліся, выказвалі розныя здагадкі, куды падзеліся студэнты. Нарэшце атрад прыехаў. Я падышла да юнака дзелавога выгляду, на куртцы якога ўбачыла камандзірскі шэўрон, і звярнулася з пытаннямі: чаму не прыслалі кватар'ераў, чаму спазніліся, чаму не папярэдзілі прымаючую арганізацыю?

— Думалі, што суправаджаючы павінен...

— Недагледзеў! — засланіў камандзіра сабою і ўзяў «агонь» на сябе · мужчына паважанага ўзросту. Як потым высветлілася, паспадзяваўся на камандзіра: ён актыўны, ініцыятыўны — думаў, самі сюды пазвоняць.

Пра суправаджаючых чула ўпершыню і доўга не магла скеміць: навошта? Але самі студэнты па пальцах пералічылі яго абавязкі: павінен пракантраляваць прыезд, дысцыпліну, забяспечыць фронтам работ.

Пытанне: чаму ён, а не самі байцы?

— Лішні кантроль не перашкодзіць...

...Урэшце, студэнту так і спакайней — ні табе лішніх клопатаў, ні лішняй адказнасці. Але ж ні для каго не сакрэт, што калі няма побач нядрэмнага вока, маладыя людзі спадзяюцца толькі на сябе, іх учынкі становяцца па-сапраўднаму сталымі, яны самі сябе кантралююць. І адказваюць за сябе самі — таксама. Вядома, недзе будуць яны памыляцца, без гэтага не абыдзецца. І добра, што не абыдзецца — памятаеце Д. І. Пісарава: «Ён (студэнт) часта захапляецца, часта робіць глупствы, але трэба памятаць, што пераход ад дзяцінства да мужнасці заключаецца менавіта ў тым, што малады чалавек шляхам уласных вопытаў, памылак і падзенняў вучыцца цвёрда стаяць на нагах і цвёрдымі крокамі накіроўвацца да свядома выбранай мэты. Каго клапатлівая рука ўтрымлівала ад усялякіх падзенняў, той ці ў пазнейшым узросце нагоніць страчаны час, ці застанецца на ўсё жыццё добра выхаваным хлопчыкам, які не мае ні характару, ні арыгінальнасці».

Гаворка пра неабходнасць даць большую самастойнасць студэнтам вядзецца часта. Але, на жаль, пакуль словы застаюцца толькі словамі і «дадатковы кантроль» за студэнтамі становіцца дробязнай апекай.

Згадзіцеся, пасля вышэйапісанага смешнай бачыцца праблема самастойнасці маладога спецыяліста. Хіба ж могуць прывучаныя да штодзённай апекі ў ВНУ выпускнікі прымаць самастойныя, дакладныя рашэнні?

**Т. ПАДАЛЯК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

СТУДЭНТ І НТП

# Дні навукі







*НА ЗДЫМКАХ: дні навукі на філалагічным факультэце; пасяджэнне секцыі рускага фальклору.*

*Фота Ю. ПЕЧУРА.*

* * *

**СТУДЭНЦКІЯ НАВУКОВЫЯ** канферэнцыі, якія прысвячаюцца дню нараджэння У. І. Леніна, праводзяцца на факультэце журналістыкі не першы год. Навуковая работа дапамагае студэнтам пашырыць свае веды па грамадскіх навуках, прывучае іх быць самастойнымі, вучыць арыентавацца ў шматлікай літаратуры.

На канферэнцыі, прысвечанай 116-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, былі заслуханы 150 дакладаў на шасці секцыях. На ёй прысутнічалі госці з Масквы, Свярдлоўска, Львова.

Глыбокім зместам былі напоўнены работы замежных студэнтаў з Марока, Кіпра, Мадагаскара. Лепшыя навуковыя работы студэнтаў будуць накіраваны на рэспубліканскую канферэнцыю.

**А. МАЕЎСКІ,**
студэнт факультэта журналістыкі.

# ПРАГРАМА ПАСКАРЭННЯ І ПРАВА

> **Пры сацыялізме права з'яўляецца важным інструментам у руках дзяржавы для ўсталявання эканамічных зносін грамадства. «Наша заканадаўства — грамадзянскае і працоўнае, фінансавае і адміністрацыйнае, гаспадарчае і крымінальнае,— адзначалася ў Палітычным дакладзе ЦК КПСС XXVII з'езду партыі,— павінна яшчэ больш актыўна дапамагаць укараненню эканамічных метадаў кіравання, дзейснаму кантролю за мерай працы і спажывання, правядзенню ў жыццё прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці».**

РАШЭННІ XXVII З'ЕЗДА КПСС — ВЫКАНАЕМ!

ВАЖНЕЙШЫМ сродкам паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця з'яўляецца навукова-тэхнічны прагрэс. У святле сучасных патрабаванняў права павінна садзейнічаць таму, каб наша эканоміка сёння стала максімальна ўспрымальнай да навукова-тэхнічнага прагрэсу. Прыярытэтнае ўкараненне новай тэхнікі і асабліва прагрэсіўнай тэхналогіі павінна быць забяспечана адпаведнымі прававымі гарантыямі. На жаль, існуючыя зараз прававыя нормы ў гэтых адносінах малаэфектыўныя.

Сёння вучоным-юрыстам неабходна больш глыбока і поўна даследаваць прававое становішча аграпрамысловых, машынабудаўнічых і іншых буйных народнагаспадарчых комплексаў. Чакае дакладнага навуковага абгрунтавання прававое забеспячэнне ўсіх прынятых за апошні час маштабных праграм, у прыватнасці харчовай, энергетычнай, машынабудаўнічай, па развіццю вытворчасці тавараў народнага спажывання, сферы паслуг і інш.

На XXVII з'ездзе партыі пастаўлена задача стварэння ў эканоміцы цэласнай, эфектыўнай сістэмы кіравання, якая дазваляе паўней рэалізаваць магчымасці сацыялізму. У гэтых умовах актуалізуецца значэнне прыняцця Асноў заканадаўства аб кіраванні народнай гаспадаркай СССР, у якіх павінны быць вызначаны асноўныя напрамкі прававога рэгулявання зносін, узнікаючых у сферы эканомікі. Акрамя таго, у святле новых задач неабходны Гаспадарчы кодэкс. Пры распрацоўцы гэтых і іншых законаў мэтазгодна творча выкарыстоўваць вопыт па мадэрнізацыі існуючых сістэм кіравання народнай гаспадаркай, назапашаны ў братніх сацыялістычных краінах.

Сёння неабходна аб'яднаць намаганні вучоных-юрыстаў, эканамістаў у рашэнні агульных задач у сферы эканомікі. Уяўляецца, што тут адкрываюцца новыя магчымасці для плённых даследаванняў як тэарэтычнага, так і практычнага характару.

На XXVII з'ездзе КПСС адзначалася, што праграма паскарэння датычыцца не толькі эканомікі. Яна ахоплівае ўсе бакі жыцця савецкага грамадства, мае на ўвазе далейшае ўдасканаленне дзейнасці мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Як адзначалася ў Палітычным дакладзе ЦК КПСС, мясцовыя Саветы «могуць і павінны стаць адным з найбольш эфектыўных звенняў мабілізацыі мас на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны». У сувязі з гэтым заслугоўвае больш дасканалага вывучэння практыка ўдасканалення дзейнасці мясцовых Саветаў па забеспячэнню комплекснага эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

Мясцовыя Саветы павінны ў поўнай меры выкарыстоўваць вялікія правы, якія ім прадастаўляюцца. Аднак выкарыстоўваць правы можа толькі супрацоўнік выканкома, які ведае, як гэта зрабіць. У святле сказанага выклікае заклапочанасць той факт, што ў апараце выканкомаў мясцовых Саветаў нашай рэспублікі недастаткова работнікаў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Гэта абумоўлівае неразуменне некаторымі савецкімі работнікамі духу і літары закона, а адсюль — прыняцце незаконных рашэнняў і іншыя нядбайнасці ў праваприменяльнай дзейнасці. Каб ліквідаваць гэтыя негатыўныя з'явы, неабходна, на нашу думку, ажыццяўляць, у прыватнасці, наступныя меры: увесці замяшчэнне шэрагу кіруючых пасад у выканкомах мясцовых Саветаў асобамі, якія маюць вышэйшую юрыдычную адукацыю; больш накіроўваць выпускнікоў юрыдычных факультэтаў універсітэтаў, якія праходзяць спецыялізацыю па дзяржаўна-прававому цыклу, на работу ў апарат выканкомаў; палепшыць вывучэнне пытанняў савецкага будаўніцтва на рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі партыйных і савецкіх работнікаў пры Мінскай вышэйшай партыйнай школе і на аналагічных курсах пры абласных камітэтах партыі.

Трэба больш праводзіць навуковых эксперыментаў у галіне савецкага будаўніцтва. Такія эксперыменты, як паказвае вопыт вучоных-юрыстаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, валодаюць высокімі пазнавальнымі магчымасцямі, з'яўляюцца дастаткова эфектыўным метадам адкрыцця пэўных заканамернасцей, дазваляюць вызначыць, у якім напрамку павінна быць забяспечана прававое рэгуляванне тых ці іншых грамадскіх зносін.

Трэба прызнаць, што вучоныя-юрысты не заўсёды канцэнтруюць сваю ўвагу на найбольш актуальных пытаннях дзяржавы і права. У прыватнасці, яшчэ недастаткова праводзіцца даследаванняў па такіх праблемах, як права і навукова-тэхнічны прагрэс, права і эканоміка і іншыя. Дрэнна займаюцца прадстаўнікі юрыдычнай навукі пытаннямі прафілактыкі, прадухілення правапарушэнняў.

У святле сучасных патрабаванняў вучоным-юрыстам неабходны новы якасны зрух у навуковых даследаваннях.

Да смелых, наватарскіх пастановак, да спаборнасці ў галіне навукі, выпрацоўкі адказных вывадаў, прапаноў і рэкамендацый заклікаюць рашэнні XXVII з'езда КПСС. Абавязак кожнага вучонага-юрыста — актыўна ўключыцца ў ажыццяўленне рашэнняў партыйнага з'езда.

**В. ЦІХІНЯ.**
**дэкан юрыдычнага факультэта, доктар юрыдычных навук.**

КАНФЕРЭНЦЫІ

# Памяці Э.Тэльмана



АДБЫЛАСЯ навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Эрнста Тэльмана і 40-годдзю заснавання СЕПГ і ССНМ. З Масквы для ўдзелу ў ёй прыбылі загадчык студэнцкага аддзела пасольства ГДР у СССР прафесар Клаус Дзіц і сакратар ГК ССНМ Петэр Франк.

Выступаўшыя на канферэнцыі дацэнт П. А. Шупляк, намеснік дэкана гістарычнага факультэта, Эвелін Зандлас і Шульцэ Дагмар, студэнткі гістарычнага факультэта, намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрвыхаванню А. Самуйліч расказалі аб жыцці і дзейнасці Э. Тэльмана, аб братэрскіх сувязях і супрацоўніцтве ВЛКСМ і ССНМ.

*А. ТАЧЫЦКАЯ.*
*Фота А. МАКСІМАВА.*

# ГАЛОЎНЫ АРЫЕНЦІР

РЭФОРМЕ ШКОЛЫ — КЛОПАТ ВНУ!

**Калектыў філалагічнага факультэта звярнуўся да кафедраў і навуковых падраздзяленняў універсітэта са Зваротам, на факультэце прыняты мэтавыя сацыялістычныя абавязацельствы па ажыццяўленню Закона аб школьнай рэформе.**

**Наш карэспандэнт звярнуўся да намесніка загадчыка кафедры рускай мовы дацэнта І. А. Рабчынскай з некалькімі пытаннямі.**

**— Які ўклад кафедры рускай мовы ў выкананне сацыялістычных абавязацельстваў?**

— Рэформа школы стала адным з галоўных арыенціраў у дзейнасці нашай кафедры. Сувязі калектыву кафедры рускай мовы з агульнаадукацыйнай школай разнастайныя. Па-першае, падрыхтоўка і выданне падручнікаў для сярэдняй школы. Вытрымаў 6 перавыданняў падручнік «Русский язык. Учебник для 5—6 класса школ с белорусским языком обучения» пад рэдакцыяй загадчыка кафедры, прафесара, доктара філалагічных навук П. П. Шубы. Гэты падручнік адзначаны сярэбраным медалём ВДНГ СССР. Таксама карыстаюцца попытам падручнік «Беларуская мова» для 3 класа школ з рускай мовай навучання пад рэдакцыяй П. П. Шубы, дапаможнік дацэнта Л. А. Мурынай «Развіццё звязнай гаворкі навучэнцаў», тлумачальныя слоўнікі рускай і беларускай моў для сярэдняй школы, шэраг іншых вучэбных выданняў.

Па-другое, работа членаў кафедры з настаўнікамі школ, якія павышаюць сваю кваліфікацыю ў інстытутах удасканалення. У гэтай рабоце актыўна ўдзельнічаюць найбольш вопытныя супрацоўнікі кафедры — П. П. Шуба, А. Ф. Манаенкава, А. А. Шаўчэнка, Л. А. Мурына, Т. П. Плешчанка, І. К. Германовіч, М. П. Дубаграева, І. А. Карабань, Н. К. Фядотава, Ф. М. Літвінка і іншыя. Кафедра мае багаты вопыт у правядзенні алімпіяд па рускай мове сярод школьнікаў рэспублікі. За іх падрыхтоўку і добрае правядзенне супрацоўнікі кафедры былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі МінВНУ БССР і ЦК ЛКСМБ.

**— Што новага ў работу кафедры ўнесла рэформа школы?**

— Больш трывалымі становяцца сувязі нашай кафедры з кіруючымі органамі Міністэрства асветы БССР. Загадчык кафедры прафесар П. П. Шуба з'яўляецца старшынёй секцыі рускай мовы і літаратуры вучэбна-метадычнага савета Мінасветы БССР, членам секцыі рускай мовы нацыянальнай школы вучэбна-метадычнага савета Мінасветы СССР. Кафедра вядзе вялікую работу па карэкціроўцы школьных праграм па рускай і беларускай мовах для 1—10 класаў школ рэспублікі.

Але адна з галоўных нашых задач — падрыхтоўка на факультэце высокакваліфікаваных настаўнікаў рускай мовы для сярэдніх школ. Сённяшні студэнт філалагічнага факультэта — заўтра галоўная асоба, якая праводзіць рэформу школы ў жыццё. Іменна гэтым кіравалася кафедра, калі рыхтавала і працягвае рыхтаваць вучэбныя комплексы не толькі для школ, але і для філалагічных факультэтаў універсітэтаў БССР. Падручнік «Современный русский язык» для студэнтаў філалагічных факультэтаў пад рэдакцыяй П. П. Шубы ўжо зараз налічвае 5 вучэбных дапаможнікаў. Аўтарскі калектыў напружана працуе над падручнікам па рускай мове для 7—8 класаў з беларускай моваю навучання. Усю гэту работу мы лічым важным укладам у выкананне Закона аб школьнай рэформе.

Значныя перамены адбыліся і ў арганізацыі педагагічнай практыкі студэнтаў. Пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры Л. А. Мурынай распрацаваны план і праграма бесперапыннай педагагічнай практыкі студэнтаў аддзялення рускай мовы і літаратуры, пачынаючы з І курса. Напружана і клапатліва працуюць зараз супрацоўнікі кафедры Ф. М. Літвінка, М. П. Дубаграева, выкладчыкі Т. В. Сянюта, Ж. Э. Бычкоўская, Г. Б. Кажушкова і іншыя над укараненнем у жыццё гэтай праграмы.

Гутарку вёў
**А. СЦЯПАНАЎ.**

# ЗА ЭФЕКТЫЎНУЮ ПРАЦУ, ЗДАРОВЫ БЫТ

ЦВЯРОЗАСЦЬ — НОРМА ЖЫЦЦЯ!

**Амаль паўтары тысячы студэнтаў нашага універсітэта аб'яднали свае намаганні ў «Добраахвотным таварыстве барацьбы за цвярозасць». Аднак многія студэнты не зусім яскрава ўяўляюць, як будзе весціся работа таварыства, чым наогул будуць займацца яго члены.**

**Сёння наш карэспандэнт гутарыць са старшынёй таварыства Г. І. Аляхновіч.**

**— Галіна Іванаўна, якія асноўныя напрамкі вызначаны ў рабоце?**

— Працаваць мы будзем галоўным чынам па трох напрамках. Гэта: прафілактычны, арганізацыйны, прапагандысцкі. Уся работа будзе весціся ў цесным кантакце з камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі. Наша мэта — аб'яднаць у сваіх радах усіх сапраўдных энтузіястаў, усіх прыхільнікаў поўнага спынення ўжывання алкаголю, якія б сваёй штодзённай мэтанакіраванай барацьбой за цвярозасць, асветніцкай работай змаглі б падняць шырокія масы людзей на пераадоленне п'янства і алкагалізму, паўсюднае зацвярджэнне цвярозага ладу жыцця.

**— Галіна Іванаўна, у статуце няма асобнага пункта, які б забараняў піць наогул. Чаму?**

— Таварыства павінна аб'яднаць людзей, якія ўяўляюць сабой прыклад поўнага адмаўлення ад алкагольнага дурману, людзей актыўных, узорных у вучобе і працы. Сапраўды, статут не забараняе піць наогул, але піць ці не піць, павінны вырашаць самі людзі. Наша мэта — паказаць, што і без спіртнога можна жыць цікава. Якраз на гэту тэму мы плануем дыспуты «Ці можа быць свята цікавым без выпіўкі?», «Вашы адносіны да п'янкі?».

**— Большасць студэнтаў жыве ў інтэрнаце. Якая работа будзе весціся там?**

— Студэнцкі інтэрнат, бадай, галоўны аб'ект нашых дзеянняў. Тут мы павінны арганізаваць, а дзе трэба — актывізаваць дзейнасць клубаў па інтарэсах. Іх мэта — навучыць людзей цікаваму, змястоўнаму адпачынку, дапамагчы адкрыць і рэалізаваць асабістыя здольнасці. Вялікую ўвагу надаём спартыўнаму выхаванню. У інтэрнатах будуць арганізаваны спартыўныя базы. Тыя, хто любіць турызм, пад кіраўніцтвам вопытных турыстаў змогуць пайсці ў паход. Асаблівую ўвагу надаём нагляднай агітацыі. Ва ўсіх інтэрнатах ужо аформлены стэнды па антыалкагольнай прапагандзе.

**— На што пойдуць даходы ад членскіх узносаў?**

— Уся дзейнасць таварыства будуецца на прынцыпах самаакупляемасці. Асноўны ж даход ад дзейнасці будзе выкарыстаны на патрэбы таварыства. Гэта і набыццё неабходнага спартыўнага інвентару, і матэрыяльная дапамога клубам на інтарэсах.

**— Як ажыццяўляецца прыём у члены таварыства?**

— Прыём праходзіць толькі на добраахвотных пачатках агульным сходам пярвічнай арганізацыі. Тут патрэбна спыніцца на двух момантах, якія патрабуюць тлумачэння. Пры абмеркаванні былі прапановы прымаць у таварыства ўсіх, хто жадае, у тым ліку, і «культурна спажываючых». Прапаноўвалася таксама і калектыўнае членства ў таварыстве, якое прадугледжвала б прыём у яго члены цэлых калектываў: груп, курсаў. Але гэта нарадзіла б толькі фармальную масавасць, якая, акрамя шкоды, нічога не дала б. Мы павінны змагацца не за колькасць, а за якасць, таму прыём у таварыства ажыццяўляецца толькі індывідуальна.

Зараз таварыства налічвае 2,5 тысячы сваіх членаў, з іх 1543 — студэнты. Да нас ідуць людзі, якія хацелі б аб'яднаць свае намаганні ў барацьбе з заганай, якая глыбока турбуе сучаснікаў. Працаваць з такімі людзьмі лёгка і прыемна.

Запісаў
**А. ДЗЯДОК.**

ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

Прафбюро механіка-матэматычнага факультэта знайсці можна па той прыкмеце, што яго дзверы пастаянна адчыняюцца. Ідуць сюды студэнты з усімі сваімі пытаннямі, клопатамі. Прафбюро, якое ўзначальвае Іна Добыш, заўсёды гатова дапамагчы ім.

# Знайшлі агульны інтарэс

**— Іна, вядома, што правядзенне вольнага часу ў інтэрнаце — пытанне набалелае. Якую дапамогу ў арганізацыі вольнага часу студэнтаў аказвае студсавету ваша прафбюро?**

— Адной з самых даступных форм работы ў інтэрнаце з'яўляецца правядзенне лекцый. Бывае так, што лектар прыходзіць да студэнтаў і сустракае або паўпустую залу, або пасіўную аўдыторыю. Каб не здарылася гэтага, мы рыхтуемся да лекцыі загадзя і вельмі сур'ёзна. Лектар прыходзіць да нас з тэмамі, якія былі «заказаны» самімі студэнтамі. Тэматыка лекцый была складзена па выніках апытання яшчэ ў пачатку навучальнага года.

**— А як на вашым факультэце адносяцца да студэнцкіх сем'яў? Ці сустракаюць яны ўвагу з боку дэканата, грамадскіх арганізацый і, у прыватнасці, прафкома?**

— Вучоныя высветлілі, што сямейныя студэнты больш адказна адносяцца да вучобы. І вынікі сесій у іх лепшыя, чым у іншых. Гэта на нашым факультэце ўзялі пад увагу даўно. Сем'ям аказваецца падтрымка і дапамога. Усе 115 студэнцкіх сем'яў факультэта атрымліваюць матэрыяльную дапамогу. Большасць забяспечваецца талонамі на харчаванне, іх абслугоўваюць у стале заказаў. Для дзяцей правялі навагодні раніshнік. Малышы атрымалі падарункі ад нашага прафсаюза. Плануецца выдзеліць два паверхі ў інтэрнаце № 7 для сямейных.

**— Раскажы, Іна, пра арганізацыю летняга адпачынку студэнтаў.**

— Амаль усе нашы студэнты з'яўляюцца байцамі СБА. Іх на факультэце сёлета створана адзінаццаць. Арганізавалі педагагічны атрад. У час летніх канікулаў студэнты маюць магчымасць адпачыць у лагерах «Нарач» і «Феадасійскі», а на працягу вучэбнага года — ва універсітэцкім прафілакторыі.

**— Іна, мы ведаем, што ў вас на факультэце студэнты ў асноўным старанныя. Як вы адзначаеце лепшых?**

— Гэта пытанне ў нас добра прадумана. Лепшая група поўнасцю забяспечваецца стыпендыяй на семестр. У канцы года арганізоўваем экскурсіі. Наша лепшая група 4 курса пазнаёмілася з Кіевам, а 11 група 5 курса пабывала ў Вільнюсе. Вядома, выносім падзякі, узнагароджваем граматамі.

На мой погляд, галоўны поспех нашага прафбюро ў тым, што нам удалося знайсці нітачку агульнага інтарэсу.

Інтэрв'ю правялі
**І. РУСЕЦКАЯ,**
**К. ЧАПЛЯ.**

ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

*НА ЗДЫМКУ: Валерый Аляксандравіч Зайкоў, старшы інжынер кафедры фізічнай электронікі і студэнты IV курса III групы факультэта радыёфізікі і электронікі Алена Коцан і Уладзімір Пракоф'еў у лабараторыі дыягностыкі плазмы.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*



# «А ТЫ ПАМЯТАЕШ?..»

**Кожнаму з нас вядома вострае пачуцце радаснага чакання сустрэчы са сваёй маладосцю, сыноўняй удзячнасці пры спатканні са сваёй alma mater. Не будзе залішне смелым сцвярджэнне, што многія з тых, хто сабраўся нядаўна на вечар выпускнікоў філалагічнага факультэта, адчулі нешта падобнае, падыходзячы да свайго дома на Чырвонаармейскай вуліцы.**

## МАЦАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ



Сёлетняя сустрэча была ў асноўным традыцыйнай, але было шмат новага і ў форме, і ў змесце.

Гэта адзначыў ва ўступным слове дэкан філфака А. А. Волк. Ён сказаў аб тых вялікіх задачах, якія паставіў XXVII з'езд перад работнікамі ўсіх сфер, расказаў аб дасягненнях аднаго з самых вялікіх факультэтаў, якому ёсць чым ганарыцца.

Потым выступіла намеснік начальніка ўпраўлення школ, начальнік праграмна-метадычнага аддзела Міністэрства асветы БССР К. І. Краўцова. Клаўдзія Ільінічна падкрэсліла вялікую ролю выпускнікоў, якія прыходзяць працаваць у народную асвету, расказала аб рэалізацыі рэформы агульнаадукацыйнай школы.

Загадчык кафедры рускай мовы П. П. Шуба сказаў: «Я рады бачыць вас тут. Мы ў нейкай ступені студэнты. Незалежна ад тэрміну, які прайшоў пасля атрымання дыплома». Выступаючы спыніў увагу на найбольш важных пытаннях забеспячэння якаснага правядзення рэформы школы. Выказаў заўвагі наконт новых праграм.





А. А. Лойка, загадчык кафедры беларускай літаратуры: «Я буду гаварыць пра памяць і пра любоў» і гаварыў аб тым, што да рэформы трэба адносіцца адказна, сур'ёзна, каб не згубіць тое, што было здабыта раней, але многае патрэбна перагледзець, каб заставалася і ўзмацнялася наша памяць і любоў да роднай зямлі, Бацькаўшчыны, роднай літаратуры.

Выпускніца 1984 года Таццяна Буркун падкрэсліла, што кожны з філфакаўцаў часта ўспамінае сваіх настаўнікаў, і сёння на гэтай сустрэчы мы гаворым ім вялікае дзякуй за любоў і клопат.

А. І. Мальдзіс, выпускнік 1956 года, вядомы вучоны-славяніст, гісторык, пісьменнік, пажадаў студэнтам настойлівасці ў авалоданні ведамі.

Абмен думкамі па надзённых пытаннях быў прадоўжаны пасля канцэрта. Усім спадабаліся выступленні студэнтаў і народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш».

...Доўга яшчэ ў калідорах факультэта гучала: «А ты памятаеш..?», запісваліся адрасы аднакурснікаў.

**Г. ЮРЧАНКА.**
**Фота аўтара і**
**Ю. ПЕЧУРА.**

---

РЭЙД

# ДАВАЙЦЕ БУДЗЕМ ГАСПАДАРАМІ!

**Інтэрнат — другі дом студэнта. Так яно павінна быць. А ці ёсць так на справе? Штаб «Камсамольскага пражэктара» універсітэта правёў рэйд з мэтай высветліць, як у інтэрнатах працуюць чытальныя залы і ленінскія пакоі. Іменна яны прызначаны для вучобы і адпачынку студэнтаў. Рэйдавая група ў саставе старшыні штаба «КП» Ю. Варатніцкага, намесніка старшыні І. ЧУШАНКОВА, старшыні штаба «КП» фізфака Л. АБРАМАВАЙ пабывала ў трох інтэрнатах БДУ.**

## ПАД ВОСТРЫМ ВУГЛОМ

**Кастрычніцкая, 2. Інтэрнат № 2.**

**УЖО ПАСЛЯ** рэйду стала зразумела, што іменна ў хімікаў, фізікаў, журналістаў, якія складаюць асноўную колькасць жыхароў інтэрната, найбольш шансаў цікава і змястоўна адпачываць і вучыцца, чым у іх таварышаў-студэнтаў з шостага і сёмага інтэрнатаў. Сама планіроўка будынка дае гэтыя магчымасці. Кожны паверх мае і чытальную залу, і ленінскі пакой. Мэць — гэта пачатак. А працяг... На жаль, працяг атрымаўся не зусім той, які б хацелася.

Удзельнікам рэйду, відаць, проста не пашанцавала. Ніводнага мерапрыемства ў інтэрнаце ў дзень праверкі не было, за выключэннем сходу кубінскіх студэнтаў. Каго мы засталі ў чыталках?

Што датычыць чытальных залаў, то людзей там было мала. Нехта сказаў услед нам: «Дзівакі! Шукаюць некага ў чыталцы, калі да сесіі яшчэ часу багата».

«Загружанасць» ленінскіх пакояў пад рэгламент сесіі не падыходзіць. Але і там «знайшлі» мы не так ужо і багата студэнтаў. На 9 паверсе глядзелі тэлевізар. Дарэчы, гэты від правядзення вольнага часу — самы папулярны ў інтэрнаце.

— Неабходна, каб тэлевізары былі на кожным паверсе, — гаворыць старшыня студсавета Станіслаў Міхайловіч.— А ў нас іх толькі чатыры, ды і то два не працуюць.

Зазначу, што ў другім інтэрнаце «ленінкі», як кажуць студэнты, выкарыстоўваюцца па-рознаму. Напрыклад, на 11 паверсе створаны пакой тэхнічнай творчасці. Юнакі рамантуюць для інтэрната радыёкропкі, транзістары, займаюцца тэхнічнай творчасцю. Паколькі ў інтэрнаце жыве шмат студэнтаў з замежных краін, то частка ленінскіх пакояў аформлена, як пакоі зямляцтваў, клубаў дружбы. У памяшканні ленпакоя на 4 паверсе абсталяваны радыёвузел, на 3 — пакой студсавета. Гэта добра. Але вось эфектыўнасць выкарыстання гэтых памяшканняў жадае лепшага. Палова з іх была ў дзень рэйду (дзевятая гадзіна вечара!) зачынена. Ні ў адным з ленпакояў не ўбачылі мы планаў работы. Ды і афармленне ленінскіх пакояў, а яшчэ ў большай ступені чытальных залаў — не на ўзроўні.

**Кастрычніцкая, 10. Інтэрнат № 6.**

— Вось наш ленінскі пакой, — Іра Баравік, старшыня студсавета гасцінна расчыніла дзверы.

На відным месцы і план работы пакоя, і графік дзяжурства членаў студсавета. Тут жа стаіць і адзіны на ўвесь інтэрнат тэлевізар. Больш няма дзе паставіць, так растлумачыла Ірына.

Калі верыць таблічцы, то гэты пакой адкрыты штодзень з 18 да 23 гадзін, а ў нядзелю — з 9 да 23. А ці часта сюды прыходзяць студэнты? Як выконваецца вывешаны ў ленпакоі план работы?

— Я туды не хаджу,— сказала А. Шыліна, студэнтка ФПМ.

—Чаму?

— ?

— Быў у лютым вечар паэзіі К. Сіманава. Часам фільмы абмяркоўваем, — дадала Наташа Будкевіч з 714 пакоя.

Так і не пачулі мы ад студэнтаў расказу пра работу адзінага ленінскага пакоя. На 13-павярховы будынак, прама скажам, малавата. Але і тое, што ёсць, не зусім добра выкарыстоўваецца. Не зусім актыўна арганізоўвае вольны час студэнтаў і клуб «Красавік», што працуе ў інтэрнаце. Ці не яму ў кантакце са студсаветам трэба было б правесці аналіз сваіх магчымасцей і ажывіць работу ленінскага пакоя?

**Кастрычніцкая, 10 а. Інтэрнат № 7.**

Наш гід — студэнцкі камендант Ігар Зеляноўскі — паказваў і расказваў пра ленпакоі і чыталкі нават з ноткай гонару, калі ішла гаворка пра лепшыя з іх.

Пакой дружбы філфака... На пятым паверсе ў ленінскім пакоі праходзяць лекцыі па міжнароднаму становішчу, вечары пытанняў і адказаў. На 8 паверсе абсталёўваецца спартыўны пакой. На дзевятым працуе бібліятэка. Гэта здабытак сёмага інтэрната. Няхай сабе не ўсё могуць знайсці тут студэнты, але асноўныя падручнікі, мастацкую літаратуру пачытаць узяць можна. Пра ленпакой 11 паверха І. Зеляноўскі сказаў, калі яшчэ падымаліся па лесвіцы:

— Гэта лепшы наш пакой...

Чысціня, падшыўкі газет, планы на год і на месяц. Гэта адзін бок ленінскага пакоя, а другі...

— ...Не ведаем. Але чулі, што працуе. Мы туды не ходзім,— сказалі нам у блоку 1104.

— Добра працуе. Тэлевізар можна паглядзець, — паведаміла Валя Шаўлюк, пяцікурсніца з мехмата.

Склалася ўражанне, што частку студэнтаў ленпакой і чыталка наогул не цікавяць. І яшчэ адно назіранне. Планы работы ёсць, але прынцып работы атрымліваецца бясплáнавы. Сабраліся, ідэя ёсць, правялі сустрэчу... А план... Дык яго даўно і адзін чалавек складаў...

Другі, шосты, сёмы інтэрнаты размешчаны побач, на адной вуліцы. Розныя ў іх «чыталкі» і «ленінкі». Недзе лепш афармлены, недзе горш. У некаторых нешта праводзіцца, а некаторыя большую частку дня на замку. Агульнае ў іх ёсць таксама: эфектыўнасць выкарыстання малая, аддача — слабая.

Якімі павінны быць ленінскія пакоі і чытальныя залы? Ці не час ужо задаць гэтае пытанне ўсім студсаветам і разам са студэнтамі паспрабаваць знайсці адзінае, правільнае рашэнне. Не проста яго прыняць, але і пачаць дзейнічаць. Нашы «чыталкі» і «ленінкі» павінны ажыць. Не толькі студсавет ды каменданта павінны хваляваць іх афармленне і работа. Гэта наша — хатняе. А ў добрых гаспадароў у доме ўсё да месца.

**С. ГОГАЛЬ,**
член рэйдавай брыгады.

---

ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО АДПАЧЫНКУ

# «ШУКАЕМ П'ЕСУ»

ВЫ ЛЮБІЦЕ ТЭАТР? Тады вам, зразумела, знаёмы народны тэатр-студыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Мінчане памятаюць, як шумелі яго прэм'еры, як моладзь горада імкнулася трапіць на яго спектаклі. На сцэне універсітэта ішлі пастаноўкі «Маці» К. Чапека, «Адны, без анёлаў» Л. Жухавіцкага, «Дальняя дарога» А. Арбузава, «Вестсайдская гісторыя» Н. Лоурэнса, «Валянцін і Валянціна» М. Рошчына, «Дзве стралы» А. Валодзіна і іншыя. Вялікім поспехам у гледачоў карыстаўся спектакль «Адпачынак па раненню» В. Кандрацьева, пастаўлены рэжысерам В. Анісенкам. Былі ў калектыве свае адкрыцці, узлёты, многае радавала, нешта засмучала. Прыйшлося тэатру перажыць і нялёгкі перыяд упадку творчых сіл.

Ідзе час, пакідаюць выпускнікі, абнаўляецца акцёрскі састаў.

Апошнія два гады тэатрам кіруе рэжысер Барыс Втораў, вядомы мінскаму гледачу па пастаноўках у тэатры імя Я. Купалы, тэатры-студыі кінаакцёра і тэатры музычнай камедыі. У студэнцкім тэатры рэжысёр паставіў у якасці вучэбнага спектакля рускі вадэвіль У. Салагуба «Бяда ад пяшчотнага сэрца» і спектакль «А світанкі тут ціхія...» Б. Васільева.

Ідзе рэпетыцыя апошняй работы калектыву — вадэвіля-жарту «Юбілей» А. П. Чэхава. Рэжысёр на стамляецца дабівацца ад выканаўцаў усё больш дакладнага вядзення ролі. Ён гаворыць:

**— На кожную ролю трэба затрачваць розум, душу і з кожным разам страты павялічваць — рабіць усё як бы нанава. Манета зацiраецца ад таго, што вельмі шмат людзей трымаюць яе ў руках, ігра ж акцёра не павінна горшаць ад паўтарэння: кожны раз трэба знаходзіць у сабе сілы іграць свежа, па-новаму...**

Нарэшце, прэм'ера. У зале мітусня перад пачаткам спектакля. Але вось раздаюцца гучныя апладысменты, і ў залу ўбягае старшыня праўлення Н-скага таварыства ўзаемнага крэдыту Шыпучын (А. Гаруновіч). І — адна за другой смешныя сітуацыі. За знешне займальнай фабулай крыецца шмат сур'ёзных разважанняў, асацыяцый. Бо пад прыцэлам з'ява, якая сустракаецца і ў нашым жыцці не так ужо рэдка: паказуха. Тэатр выступае супраць руціны і абмежаванасці, супраць фальшу і знешняга бляску. У фінале п'есы гучыць смех Шыпучына, смех з самога сябе, са свайго камічнага становішча — чэхаўскі смех, які выкрывае заганы.

У спектаклі гучыць цудоўная музыка кампазітара А. Шнітке, якая арганічна ўплятаецца ў сюжэт, дапамагае іграць акцёрам, успрымаць жарт гледачам. Шчырыя пачуцці і сапраўдная вера адчуваюцца ў акцёрскім падыходзе.

Пасля прэм'еры гутару з рэжысёрам.

**— Няма лепшай школы для акцёраў, — гаворыць Б. Втораў,— чым вострая камедыя і вадэвіль. А чэхаўская тэма заўсёды хвалюе, работа над яго творамі — гэта свята. У будучым хочам паставіць «Тры сястры» Чэхава і «Свае людзі — сквітаемся» Астроўскага. На жаль, нашы драматургі зараз мала пішуць студэнцкіх п'ес. Мы шукаем добрую, маладзёжную, сучасную п'есу...**

**Л. ЕСІПЕНКА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

24 красавіка 1986 г.

АТ 19081. Зак. 471.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73. ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.